Зарегистрировано в Национальном реестре правовых актов

Республики Беларусь 28 декабря 2018 г. N 9/93429

## РАШЭННЕ ГРОДЗЕНСКАГА АБЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА
## 17 снежня 2018 г. N 751

## АБ ПАРАДКУ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ АБЛАСНОГА ШТОГАДОВАГА КОНКУРСУ ІМЯ А.І.ДУБКО "ТВОРЧЫЯ ДАСЯГНЕННІ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА"

(в ред. решений Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172,
от 20.04.2023 N 193)

На падставе падпункта 4.1 пункта 4 артыкула 210 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, пункта 1 артыкула 40 Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 студзеня 2010 г. N 108-З "О местном управлении и самоуправлении в Республике Беларусь" Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт РАШЫЎ:
(в ред. решений Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172, от 20.04.2023 N 193)

1. Зацвердзіць Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога штогадовага конкурсу імя А.І.Дубко "Творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва" (прыкладаецца).
(п. 1 в ред. решения Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172)

2. Дадзенае рашэнне ўступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Старшыня У.В.Краўцоў

Кіраўнік спраў І.А.Папоў

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Гродзенскага абласнога
выканаўчага камітэта
17.12.2018 N 751

## ІНСТРУКЦЫЯ
## АБ ПАРАДКУ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ АБЛАСНОГА ШТОГАДОВАГА КОНКУРСУ ІМЯ А.І.ДУБКО "ТВОРЧЫЯ ДАСЯГНЕННІ Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА"

(в ред. решений Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172,
от 20.04.2023 N 193)

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога штогадовага конкурсу імя А.І.Дубко "Творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва" (далей - конкурс).

2. Конкурс праводзіцца з мэтай:

стымулявання дзейнасці работнікаў культуры і мастацтва;

вызначэння найбольш значных праектаў і праграм у сферы культуры;

актывізацыі творчай ініцыятывы і інтэлектуальнага патэнцыялу спецыялістаў сферы культуры і мастацтва, майстроў народнай творчасці.

3. Арганізатарам конкурсу з'яўляецца Гродзенскі абласны выканаўчы камітэт (далей - аблвыканкам).

4. Для арганізацыі і правядзення конкурсу, падвядзення яго вынікаў распараджэннем старшыні аблвыканкама ствараецца абласная камісія. У абласную камісію ўключаюцца прадстаўнікі структурных падраздзяленняў аблвыканкама, а таксама прадстаўнікі ўстаноў культуры Гродзенскай вобласці, грамадскіх аб'яднанняў, творчых саюзаў і іншых арганізацый (з іх згоды).

5. Абласная камісія:

размяшчае ў друкаваных сродках масавай інфармацыі (глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт) аб'яву, якая адпавядае патрабаванням пункта 4 артыкула 927 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь;

прымае дакументы ад удзельнікаў конкурсу;

вызначае пераможцаў па кожнай намінацыі.

6. Удзельнікамі конкурсу могуць быць работнікі ўстаноў культуры і мастацтва, адукацыі ў сферы культуры, арганізацый, на якія ўскладзены функцыі рэдакцый сродкаў масавай інфармацыі незалежна ад форм уласнасці, члены творчых саюзаў, якія маюць асабістыя значныя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва, вызначыліся ў творчай, мастацкай і (ці) выкладчыцкай дзейнасці, дасягнулі поспехаў у бібліятэчнай і музейнай справе, развіцці народных рамёстваў, рэжысёрскім і акцёрскім майстэрстве, мастацкай, літаратурнай і журналісцкай дзейнасці ў перыяд з 1 кастрычніка года, папярэдняга году правядзення конкурсу, па 30 верасня года правядзення конкурсу.
(в ред. решения Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172)

7. Конкурс праводзіцца па намінацыях:

"Клубны работнік года";

"Бібліятэкар года";

"Музейны работнік года";

"Выкладчык года";

"Настаўнік школы мастацтваў года";

"Народны майстар года";

"Артыст года";

"Рэжысёр года";

"Мастак года";

"Пісьменнік года";

"Музыкант года";

"Журналіст года";

"Мастацкі кіраўнік народнага (заслужанага) аматарскага калектыву года";

"Мастацкі кіраўнік узорнага (заслужанага) аматарскага калектыву года".

8. Да 15 кастрычніка года правядзення конкурсу, у абласную камісію накіроўваюцца наступныя дакументы на кандыдатаў для ўдзелу ў конкурсе:
(в ред. решения Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172)

заяўка на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам;
(в ред. решения Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172)

творчая характарыстыка;

пратакол сходу працоўнага калектыву з рэкамендацыяй аб вылучэнні кандыдатуры для ўдзелу ў конкурсе (пры наяўнасці);

копіі водгукаў у сродках масавай інфармацыі (пры наяўнасці).

9. З 15 па 31 кастрычніка года правядзення конкурсу ажыццяўляецца разгляд конкурсных дакументаў і вызначэнне пераможцаў конкурсу згодна з крытэрыямі ацэнкі.
(в ред. решения Гродненского облисполкома от 30.03.2020 N 172)

10. Вынікі конкурсу афармляюцца пратаколам абласной камісіі. На падставе пратакола аблвыканкам прымае рашэнне аб вызначэнні па аднаму пераможцу конкурсу ў кожнай намінацыі і іх узнагароджанні.

11. Пераможцы конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі і грашовымі ўзнагародамі ў памеры па 25 базавых велічынь кожнаму на ўрачыстай цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу з уручэннем букетаў.
(в ред. решения Гродненского облисполкома от 20.04.2023 N 193)

12. Фінансаванне расходаў на арганізацыю і правядзенне конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту і (або) іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

13. Вынікі конкурсу асвятляюцца ў газеце "Гродзенская праўда".

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку
арганізацыі і правядзення
абласнога штогадовага
конкурсу імя А.І.Дубко
"Творчыя дасягненні ў сферы
культуры і мастацтва"

Форма

**ЗАЯЎКА**
**на ўдзел у абласным штогадовым конкурсе імя А.І.Дубко**
**"Творчыя дасягненні ў сферы культуры і мастацтва"**

1. Намінацыя ___________________________________________________
2. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) _________
______________________________________________________________
3. Прафесія, пасада, месца працы (службы, членства ў творчым саюзе) __
______________________________________________________________
4. Дзень, месяц і год нараджэння _______________________________
5. Адукацыя ____________________________________________________
6. Месца жыхарства, нумар тэлефона _____________________________
______________________________________________________________
7. Стаж работы ў галіне ________________________________________
8. Стаж работы ў дадзеным працоўным калектыве (членства ў творчым саюзе) ____________________________________________________
9. Асабістыя заслугі, за якія прадстаўляецца да ўдзелу ў конкурсе ____
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________
______________________________________________________________

Кандыдатура ___________________________________________ рэкамендавана
______________________________________________________________
(назва арганізацыі, установы, творчага саюза, дата абмеркавання,

нумар пратакола)

Кіраўнік

___________________________                        _____________________________
(дата)                                              (ініцыялы, фамілія)